*Ю. Ю. Захарына (Мінск)*

# УПЛЫЎ ПОСТМАДЭРНІЗМУ НА СТАНАЎЛЕННЕ МАСТАЦКАГА ВОБРАЗА СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Моцнае ўздзеянне на станаўленне мастацкага вобраза ў сучасным дойлідстве аказаў постмадэрнізм, у якім знайшло адлюстраванне спалучэнне двух пачаткаў — рэалістычнага і авангарднага [1]. Першы пачатак непасрэдна быў звязаны з развіццём нацыянальных традыцый, другі ўзяў за аснову рэтраспектывізм [2]. Мастацкі вобраз сучаснага дойлідства вызначылі паняцці разнастайнасці, мнагазначнасці, двухсэнсавасці, сімвалічнасці, гістарызму, жывапіснасці, арнаментальнасці [3]. Постмадэрнісцкая архітэктура ўзыходзіць да традыцый, якія нярэдка пераўтвараюцца ў традыцыяналізм, які ўключае эклектычныя элементы. У выніку адной з форм сучаснага мастацкага вобраза дойлідства стала «бесстыльвасць» [4]. Пад уплывам тэндэнцый постмадэрнізму ў архітэктуры 70—80-х гг. ХХ ст. адбываецца адмаўленне ад элітарызму і бярэцца арыентацыя на эмацыянальныя патрэбы і густы сучаснікаў. Пры гэтым актыўна выкарыстоўваюцца формы і кампазіцыйныя прыёмы мінулага. Паступова архітэктура пераўтвараецца ў адпаведнасці з мэтамі і метадамі «масавай культуры» [5]. Пераемнасць як характэрная рыса сучаснай эпохі ўвасобілася ў дойлідстве [6].

Новыя тэндэнцыі ў сучасным дойлідстве атрымалі розную крытычную ацэнку. Некаторыя даследчыкі сцвярджалі, што ўвасабленне гістарычных стыляў у сучаснай архітэктуры стала вынікам пануючага стылістычнага кансерватызму і нізкага ўзроўню мастацкай культуры [8]. Іншая думка была звязана са сцвярджэннем неабходнасці пераасэнсавання гістарычных традыцый, якія даюць пачатак фарміравання новай архітэктуры [9].

Узмацненне ўваг да гісторыка-культурнай спадчыны спрыяла больш глыбокаму вывучэнню нацыянальных традыцый у дойлідстве. Асобная ўвага пачала надавацца пытанням сельскага будаўніцтва, дзе ў найбольшай ступені захаваліся народныя традыцыі [10—12]. У межах праблемы вывучэння і захавання гістарычных традыцый асобна вылучылася пытанне рэканструкцыі і рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў. Асноўным аспектам праблемы з'явілася задача рэканструкцыі гістарычных цэнтраў гарадоў [13—15].

Асноўнай праблемай у творчасці архітэктараў апошняй чвэрці ХХ ст. стала вяртанне мастацкаму вобразу выразнасці. Сярод горадабудаўнічых задач значнае месца займала пытанне прасторавай арганізацыі гарадоў, якое вырашалася ва ўзаемасувязі з ландшафтна-тэрытарыяльнымі пытаннямі, арганізацыяй вуліц, плошчаў, пешаходных зон і транспартных камунікацый. Найбольш яскравае ўвасабленне адзначаныя аспекты знайшлі ў арганізацыі грамадскіх цэнтраў гарадоў [16].

З узнікненнем і распаўсюджаннем ідэй постмадэрнізму абнаўляюцца мастацкія вобразныя пошукі, узмацняецца ўвага да праблемы сінтэзу мастацтваў (Л. Дзягілеў). У выніку абмежаванасці ў пастаноўцы эстэтычных задач у часы панавання канструктывізму і функцыяналізму савецкага дойлідства былі згублены традыцыйныя выразныя сродкі. Разуменне неабходнасці вяртання практыкі сінтэзу мастацтваў у дойлідства прыйшло разам з аналізам памылак, пазбаўленне ад якіх было накіравана на павышэнне мастацкай выразнасці архітэктуры. Неабходнасць узмацнення эстэтычнага боку пабудоў прывяла да таго, што першапачаткова ўвасабленне атрымаў сінтэз архітэктуры і манументальнай скульптуры, затым — архітэктуры і дэкаратыўнага жывапісу [17]. Адначасна сучасныя патрабаванні тэхнікі і эстэтыкі вызначылі неабходнасць ужывання новых мастацкіх сродкаў, адным з якіх стала дэкаратыўнае святло.

Змены патрабаванняў і матэрыяльна-тэхнічных магчымасцей грамадства прывялі да ўдасканалення і з'яўлення новых тыпаў будынкаў. Значна ўзбуйніўся маштаб пабудоў, па-

ўжывацца дамы новай планіровачнай структуры, розныя па вышыні, канфігурацыі і працягласці. Станаўленню мастацкага вобраза сучаснага дойлідства спрыяла значнае пашырэнне наменклатуры будаўнічых матэрыялаў. Сярод сродкаў мастацкай выразнасці дойлідства асобнае месца занялі колер і святло.

### Літаратура


1. Цыбульскі М. Стагоддзе бурлівых зменаў. Эпілог // Мастацтва. 2000. № 8. С. 18—22.
2. Жбанков М. Р. Постмодернизм // Новейший философский словарь / Сост. А. А. Грицанов. Мн., 1999. С. 536.
3. Дженкс Ч. Язык архитектуры постмодернизма / Под ред. А. В. Рябушкина, В. А. Хайта. М., 1985.
4. Каплун А. И. Стиль и архитектура. М., 1985.
5. Иконников А. В. Зарубежная архитектура: От «Новой архитектуры» до постмодернизма. М., 1982. С. 6.
6. Бэнэм Р. Взгляд на современную архитектуру: Эпоха мастеров / Пер. с англ. А. М. Христиани, Е. С. Гринкруг; Под ред. Е. В. Асса, А. В. Бокова. М., 1980. С. 7, 33—36.
7. Кузьмичев С. Д. К вопросу о тенденциях в сегодняшней белорусской архитектуре // Архитектура и строительство. 1995. № 2—3. С. 33—36.
8. Иконников А. В. Архитектура будущего — тенденции и прогнозы // Архитектура и материалы будущего / Науч. ред. Д. П. Айрапетов. М., 1983. С. 44—52.
9. Аладов В. Н. Состояние и перспективы развития архитектуры жилых зданий // Научно-информационный вестник БААРХ. Мн., 2003. Вып. 1. С. 19—21.
10. Chelkoff G. et al. Entendre les espaces publics. Grenoble, 1998.
11. Thibaud J. P. Le baladeur dans l'espace public urbain, essai sur l'instrumentation sensorielle de l'interaction sociale. Thèse de doctorat. Grenoble, 1992.
12. Sennett R. La ville a vue d'oeil. Urbanisme et société, traduit de l'américain par D. Dill. Paris, 1992.
13. Чэрнік В. М. Праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны і горадабудаўнічая дзейнасць // Каштоўнасці мінуўшчыны: Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння: Матэрыялы канф., Мінск, 28 ліст. 2002 г. / Пад агул. рэд. С. Марцэлева. Мн., 2003. С. 9—13.
14. Несцярчук Л. М. Дзейнасць міжнароднай супольнасці па абароне помнікаў і цэнтраў гістарычных гарадоў // Каштоўнасці мінуўшчыны: Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння: Матэрыялы канф., Мінск, 28 ліст. 2002 г. / Пад агул. рэд. С. Марцэлева. Мн., 2003. С. 62—72.
15. Крывальцэвіч Р. Я. З еўрапейскага вопыту захавання гістарычных цэнтраў гарадоў // Каштоўнасці мінуўшчыны: Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння: Матэрыялы канф., Мінск, 28 ліст. 2002 г. / Пад агул. рэд. С. Марцэлева. Мн., 2003. С. 72—81.
16. Дубяго Н. Д. Природа — связующее звено исторического развития городов // Архитектура: Материалы XXIX науч. конф. ЛИСИ. Л., 1976. С. 16—19.
17. Дягилев Л. Е. Мемориальные сооружения в современной городской среде // Научно-информационный вестник БААРХ. Мн., 2003. Вып. 1. С. 22—23.


*Н. І. Здановіч (Мінск)*

## ПОЛАЦКАЯ ГЛІНЯНАЯ ЦАЦКА ПАЧАТКУ XVIII СТ.: ЗАКАНАМЕРНАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ МАСТАЦКАЙ ТРАДЫЦЫІ

Падчас правядзення гарадскіх свят featurenага кшталту стала звыклым разгортванне «горада майстроў» ці палатак з «традыцыйнымі», у тым ліку керамічнымі, вырабамі. Сярод вырабаў дробнай пластыкі найчасцей там сустрэнеш цацкі і свісцёлкі. Каго толькі сярод іх няма: і жабкі, і сабачкі, і каты, і нават цмокі — адным словам, увесь жывёльны і казачны свет. Ды і колер самы «казачны» — жоўта-сіне-бела-брунатны. Зразумела, для нас, людзей XX ст., гэта толькі цацкі. Іх сімвалічны, а тым больш магічны сэнс даўно страчаны. Аднак